# Раздел 1
# ИСТОЧНИКИ И ИСТОРИОГРАФИЯ ИСТОРИИ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ

*Новікаў С.Я.*

## ЗАБЫТЫЯ СТАРОНКІ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 1943 – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 1944 ГОДА: КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ АНАЛІЗ НОВЫХ НЯМЕЦКІХ ДАКУМЕНТАЎ

Важкай падставай для сцвярджэння аб забытых ці нават невядомых старонках гісторыі вызвалення Беларусі для аўтара гэтых радкоў з'яўляецца той факт, што ўсебаковае даследаванне гісторыі баявых дзеянняў Чырвонай арміі на этапе вызвалення ўсходніх і паўднёвых беларускіх раёнаў, нягледзячы на з'яўленне ў апошнія гады грунтоўных навуковых прац [1; 2; 3; 4], пакуль што застаецца з асобнымі «белымі плямамі» у сучаснай беларускай і расійскай гістарыяграфіі [5; 6]. У іх пераліку без належных адказаў дагэтуль знаходзяцца вельмі складаныя гістарычныя пытанні, напрыклад: 1) аб перабежчыках (Überläufer – ням.) ці савецкіх дэзерцірах, г. зн. тых, хто самавольна пакідаў вайсковыя часці або месцы нясення службы ці нават поле бою; 2) савецкіх ваеннапалонных, якія, як высветлілася, і на этапе вызвалення Беларусі траплялі ў нямецкі палон падчас правядзення Чырвонай арміяй наступальных аперацый (Гомельска–Рэчыцкай, 10–30.11.1943 г.; Калінкавіцка–Мазырскай, 8–30.01.1944 г.; Рагачоўска–Жлобінскай, 21–26.02.1944 г.; Палеская, 15.03 – 4.04.1944 г.); 3) аб фактычным удзеле штрафных рот Чырвонай арміі, якія дзейнічалі, як правіла, у агульных баявых парадках пры вызваленні Беларусі: гэта значыць, у вырашэнні аператыўна асабліва важных ці надзвычай цяжкіх баявых задач па разведцы боем, штурму і заняцці абарончых пазіцый праціўніка, прарыву ўзмоцненых рубяжоў для забеспячэння наступлення разам з іншымі савецкімі часцямі і інш.

У першую чаргу паставім прынцыповае пытанне аб тым, ці даследавалася гэтая тэматыка айчыннай гістарычнай навукай увогуле і ў якой ступені згаданыя гістарычныя з'явы вядомы шырокаму беларускаму чытачу калектыўных даследаванняў ці аўтарскіх манаграфій у прыватнасці? З айчыннай літаратуры больш менш у апошні час стала вядомай тэма аб афіцэрскіх штрафных батальёнах – гэтак званых штрафбатах [7; 8; 9; 10, 11], якія, як вядома з загада Наркама абароны СССР № 227 ад 28.07.1942 г. (у літаратуры вядомы пад назвай «Ні кроку назад!»), фарміраваліся на кожным фронце ў залежнасці ад баявых абставін у колькасці ад адной да трох адзінак. У іх склад накіроўваліся сярэднія і старэйшыя камандзіры і палітработнікі, абвінавачаныя ў «парушэннях дысцыпліны». Такія суровыя пакаранні выносілі камандуючыя і ваенныя

Репозиторий ВГУ

саветы франтоў у дачыненні да камандзіраў рот, батальёнаў, палкоў, камісараў і палітработнікаў, якія адступілі без загаду зверху, таму аб'яўляліся «здраднікамі Радзімы». Адзіным шляхам да зняцця такога пакарання было сплочванне крывёю абавязку перад Радзімай. Пасля чаго ім вярталіся ранейшыя воінскія званні, узнагароды, правы, а для праходжання далейшай службы яны маглі быць накіраваны ў іншыя часці.

У гэтай сувязі зададзімся чарговым пытаннем адносна таго, а наколькі беларускі чытач здолее самастойна разабрацца ў такіх складаных і супярэчлівых аспектах праблемы, асабліва ва ўмовах захавання ў грамадстве ў дачыненні да штрафных рот выключна ідэалагічных ацэнак, калянавуковых стэрэатыпаў і адсутнасці пры гэтым спецыяльных навуковых даследаванняў. Адразу ж нагадаем, што ў канцы нулявых гадоў пабачыла свет праца, прысвечаныя толькі аднаму са штрафбатаў, які прымаў удзел у вызваленні Лоева, Гомеля, Рагачова і Жлобіна ў складзе 1-га Беларускага фронту [10]. Гэта гісторыка-дакументальнае выданне было прысвечана 8-му асобнаму штрафному батальёну, аўтарам якога з'яўляўся адзін з яго непасрэдных удзельнікаў – камандзір роты аўтаматчыкаў, потым адной з рот гэтага батальёна лейтэнант Пыльцын А.В. Як ён сам адзначае ў прадмове да кнігі, успаміны паказваюць толькі некаторыя баявыя эпізоды гісторыі батальёна, якія ўдалося аднавіць для чытача дзякуючы не толькі ўласных успамінам, але ў значнай меры чаргу працы аўтара з дакументамі Падольскага ваеннага архіва. Баявы афіцэр звяртае ўвагу на тое, што ў 1944 г. сярэднямесячныя страты пераменнага складу забітымі, памерлымі, раненымі і хворымі перавышалі ў 3–6 разоў узровень страт асабовага складу звычайных войскаў [10, с. 425].

Аднак Пыльцын А.В. пакідае ў сваёй кнізе без аніякай увагі большасць з акрэсленых вышэй аспектаў гэтай складанай тэмы, засяроджваючы ўвагу толькі на асобных старонках гісторыі ўдзелу 8-га штрафнога батальёна ў баях за вызваленне Беларусі. Пасля знаёмства з выданнем у чытача застануцца шматлікія пытанні аб падобных па сваім найменні баявых падраздзяленнях Чырвонай арміі – штрафных ротах? Галоўным з іх з'яўляецца наступнае: наколькі масавай з'явай у Чырвонай арміі былі штрафнікі? Колькі салдат, сяржантаў і афіцэраў (пастаяннага і зменнага складу) прайшлі праз такія вайсковыя падраздзяленні ў ходзе вызвалення Беларусі? У чым вызначаліся асаблівасці выкарыстання сяржанцка-салдацкіх і афіцэрскіх штрафных рот пры вырашэнні баявых задач? Як вызначалася аснова для камплектавання штатнага складу савецкіх падраздзяленняў падобнага роду? Чаму да гэтага часу не апублікаваны ўспаміны хоць кагосьці з тых, хто ваяваў у штрафных ротах, здолеў выжыць у баях, але так і не распавёў пра гэта на старонках газет, часопісаў ці кніг? Няўжо ніхто не хацеў расказаць праўду аб такіх франтавіках? Ці ёсць таму іншыя прычыны, чаму не знайшоўся ніхто, хто

б з апорай на ўспаміны ці малавядомыя факты, якія мелі месца ў гісторыі, здолеў бы паведаць нашчадкам аб такіх унікальных падраздзяленнях Чырвонай арміі, якія змагаліся за вызваленне Беларусі.

У гэтай сувязі ўзнікае галоўнае пытанне – чаму гэта тэма да цяперашняга часу не знайшла свайго даследчыка ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі, не стала прадметам даследавання ў навуковых працах, чаму застаецца без крытычнага аналізу. Нагадаем чытачу, што ў савецкі час тэма штрафных рот наўмысна замоўчвалася як у літаратуры, так і ў друку, а таксама ў сродках масавай інфармацыі. Ці такое замоўчванне працягваецца і надалей па той простай прычыне, што гэта катэгорыя удзельнікаў баявых дзеянняў не знаходзіла свайго замацавання ў савецкай канцэпцыі Вялікай Перамогі? Звернемся да прававых асноў фарміравання штрафных падраздзяленняў. Паводле загаду № 227, дзе ў якасці штрафніка разглядаліся «вінаватыя ў парушэнні дысцыпліны па баязлівасці або няўстойлівасці», а таксама тыя чырвонаармейцы, хто наўмысна на невыкананне загаду, членашкодніцтва, уцякаў з полю бою ці спрабаваў перайсці да ворага. Таму штрафнікі ставіліся на найбольш цяжкія ўчасткі арміі, каб даць ім магчымасць сплаціць крывёю свае злачынствы перад Радзімай [12, с. 251].

Зразумела, што для паказу гэтай складанай і надзвычай супярэчлівай праблемы прафесійнымі гісторыкамі асаблівую каштоўнасць будуць уяўляць дакументальныя крыніцы, якія могуць утрымліваюць звесткі аб такіхмалавядомых вайсковых падраздзяленнях, іх асабістым і колькасным складзе, узросце, падрыхтоўцы, узбраенні, нацыянальнасці і г.д. Асабліва важным фактарам для вывучэння гэтай тэматыкі можна назваць увядзенне ў шырокі ўжытак новых крыніц, якія ўтрымліваюць звесткі аб штрафных ротах. Мажліва, што для напісання іх усебаковай пакуль недастаткова не толькі дакументальных крыніц, але і гістарычных звестак.

Таму аўтара гэтых радкоў прапануе разгляд некалькіх даволі важных аспектаў для даследавання гісторыі штрафных рот у ходзе вызвалення Беларусі ўвосень 1943 – пачатку 1944 г. У нашым выпадку размова вядзецца пра нямецкія дакументы, якія ўяўляюць сабой рэгулярныя данясенні аддзела выведкі і контрвыведкі штаба 9-й нямецкай палявой арміі. Перш-наперш звернем увагу чытача на тое, што практычна ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі размова будзе весціся пра шматлікія прыклады фактычнага ўдзелу радавых, сяржантаў і афіцэраў у баях па вызваленні канкрэтных беларускіх населеных пунктаў, дзе побач з гераічнай і трагічнай тэматыкай гістарычнымі фактамі вайны была такая няпростая з'ява, як штрафныя роты, штрафнікі і гісторыя іх баявой дзейнасці. Апроч таго, за рамкамі гэтай гісторыі застаюцца не менш важныя жыццёвыя аспекты ваеннага мінулага, звязанага не толькі з гібеллю саміх штрафнікоў, але і з надзвычай цяжкім лёсам іх сямей, не ў першую чаргу жанчын ці бязвінных удоў, якія пасля вайны неслі крыж

Репозиторий ВГУ

матуль ці жонак здраднікаў Радзімы. Пра такія гістарычныя сюжэты айчынная гістарыёграфы ці літаратары пакуль што маўчаць.

Таксама нагадаем, што на лініі наступлення Беларускага фронту рубеж абароны трымала 9-я нямецкая палявая армія, якая знаходзіліся на правым крыле групы армій «Цэнтр» і з канца 1943 г. і ў пачатку 1944 г. адказвала за ўтрыманне абароны на даволі знаным участку ад Новага Быхава на поўначы да Жыткавіч на поўдні. Гэтая лінія пастаянна змянялася на асобных участках фронту ў напрамку на захад, што было вынікам паспяховага наступлення сіл Беларускага фронту (з красавіка 1944 г. – 1-га Беларускага фронту). Паводле нямецкіх звестак, на участку абароны 9-й германскай палявой арміі колькасць савецкіх дзеючых стралковых дывізій дасягала 39 з 11, 48, 50, 61, 65 і 63 армій [13, S. 529].

Паводле загада № 227, правам на фактычнае стварэнне штрафных рот надзяляліся ваенныя саветы армій і перш за ўсё камандуючыя арміямі, якія маглі сфарміраваць на рубяжы дзейнасці арміі ад пяці да дзесяці (гледзячы на абставіны) штрафных рот (ад 150 да 200 чалавек у кожнай), куды накіраваць радавых байцоў і малодшых камандзіраў, якія правінаваціліся ў парушэнні дысцыпліны па баязлівасці ці няўстойлівасці, і паставіць іх на цяжкія ўчасткі арміі, каб даць ім магчымасць сплаціць крывёю свае злачынствы перад Радзімай [12, с. 251]. Нагадаем, што ў плане аператыўнага падпарадкавання штрафныя роты былі прыдадзены палкам, якія забяспечвалі штрафнікоў усім неабходным, выдавалі ўзбраенне, боезапасы, вызначалі канкрэтнае заданне.

Крыніцазнаўчы аналіз нямецкіх архіўных матэрыялаў дазваляе даць адказ на пастаўленыя вышэй пытанні толькі ў некаторай ступені. У нашым выпадку размова вядзецца пра трафейную калекцыю «Александрыйскіх мікрафільмаў» [14, с. 60–69], у якіх захаваліся данясенні аддзела выведкі і контрвыведкі, падрыхтаваныя штабам 9-й нямецкай палявой арміі. Аснову данясенняў складалі звесткі, атрыманыя ў ходзе допытаў савецкіх ваеннапалонных і перабежчыкаў па некалькіх важных пазіцыях, звязаных з: 1) баявымі часцямі (іх баяздольнасцю, баявой моцы, складам, узбраеннямі, стратамі); 2) папаўненнем (адукацыяй, узростам, нацыянальным паходжаннем); 3) выкарыстаннем на вайсковай службе жанчын; 4) санітарным станам і ўмовамі гігіены; 5) газавай вайной; 6) савецкімі ўзбраеннямі і тэхнічным забеспячэннем; 7) уздзеяннем нямецкай зброі; 8) настроем у савецкіх вайсковых падраздзяленнях; 9) настроем і становішчам у тыле; 10) прапагандай і абслугоўваннем часцей; 11) падставамі для пераходу да немцаў; 12) умовамі харчавання і забеспячэння; 13) транспартам; 14) эканомікай і прамысловасцю; 15) абыходжаннем з нямецкімі ваеннапалоннымі; 16) рознымі пытаннямі; 17) нумарам палявой пошты [15, К. 7915486, 7915538, 7915607, 7915640, 7915662, 7915689, 7915724, 7915847, 7915945, 7915994, 7916040, 7916135,

Рэпазіторый ВДУ

7916140, 7916182, 7916186, 7916202, 7916227, 7916245, 7916272, 7916286, 7916310, 7916328].

На цяперашні час аўтарам выяўлена і апрацаваны матэрыялы 23 данясенняў, якія ахопліваюць перыяд ад 2 лютага па 9 чэрвеня 1944 г., і былі датаваны: 2.01.44, 11.01.44, 18.01.44, 23.01.44, 28.01.44, 4.02.44, 12.02.44, 23.02.44, 7.03.44, 12.03.44, 17.03.44, 24.03.44, 28.03.44, 31.03.44, 6.04.44, 13.04.44, 21.04.44, 27.04.44, 11.05.44, 21.05.44, 1.06.44, 9.06.44, 22.06.44. Як бачна, гэта былі данясенні, якія рэгулярна (раз на 5, 10 і 15 дзён) рыхтаваліся афіцэрамі армейскага штабнога аддзела выведкі і контрвыведкі на падставе атрыманых звестак. Кожнае з такіх данясенняў дасягала даволі значных тэкставых памераў: данясенне № 21 ад 21.05.1944 г. мела самы меншы памер толькі ў 13 старонак, тады як першае вясновае данясенне № 9 ад 7.03.1944 г. утрымлівала матэрыял на 72 старонках. У іх змяшчаліся самыя розныя звесткі, тэматычна падзеленыя паводле прыведзеных вышэй крытэрыяў, а таксама факты, якія не сустракаюцца ў існуючым на цяперашні час гістарычным наратыве: або размова ідзе пра сістэматызаваныя звесткі пра назвы вайсковых часцей, нумароў дывізій, палкоў, батальёнаў і рот, або даецца характарыстыка ўкамплектавання ўзбраеннямі канкрэтнага падраздзялення з прывядзеннем іх колькасных даных, або прыводзіцца падрабязная геаграфія перамяшчэння вайсковых часцей, згадваюцца імёны асобных камандзіраў батальёнаў, палкоў, дывізій і г.д. Адным з самых сур’ёзных недахопаў нямецкіх дакументаў для даследчыка можна назваць амаль поўную адсутнасць імёнаў і прозвішчаў радавых, сяржантаў і малодшага афіцэрскага складу, нягледзячы на тое, што даюцца звесткі пра ўзрост і вайсковую часць, у якой чырвонаармеец праходзіў вайсковую службу на момант палону ці наўмыснага пакідання сваіх баявых пазіцый з мэтай пераходу да ворага.

Прывядзём кароткі крыніцазнаўчы аналіз зместу данясенняў у аспекце паказу некаторых фактаў вайсковай паўсядзённасці, якая па цяперашні час у такім вымярэнні практычна застаецца па-за межамі навуковых даследаванняў.

Перш за ўсё прывядзём агульную колькасць тых, хто ў канцы 1943 – першай палове 1944 г. стаў аб’ектам практычнай дзейнасці нямецкай выведкі і контрвыведкі. З данясенняў вынікае, што за крыху больш чым за паўгода праз армейскі штабны аддзел прайшлі звесткі на 1960 чырвонаармейцаў розных вайсковых званняў, пачынаючы ад радавога без імя і прозвішча, але са звесткамі пра год нараджэння, прыналежнасць да вайсковай часці, данымі пра ўзбраенне, і завяршаючы маёрам, камандзірам палка 110-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Менавіта такая колькасць савецкіх радавых ва ўзросце ад 1893 да 1925 гадоў нараджэння, сяржантаў (2 яфрэйтараў, 9 малодшых сяржантаў, 16 сяржантаў і 10 старшых сяржантаў і 2 старшын) і афіцэраў (11 малодшых лейтэнантаў, 17 лейтэнантаў, 10 старшых лейтэнантаў і 1 капітана) патрапіла ў нямецкі

Рэпазіторый ВДУ

палон. Адзначым, што данясенні ўтрымліваюць звесткі, якія раскрываюць агульную карціну палону чырвонаармейцаў на працягу гэтага часу, адпаведна: у студзені ў палон патравілі 300 чалавек, у лютым – 359, сакавіку – 907, красавіку – 30, маі – 1 і ў чэрвені – 17. У той жа час з 23 данясенняў толькі 16 утрымліваюць звесткі пра штрафнікоў, пачынаючы з першага данясення ад 2.01.1944 і завяршаючы апошнім данясеннем № 24 ад 22.06.1944 г. За гэты ж час пакінулі свае баявыя пазіцыі і перабеглі да праціўніка, г. зн. дэзерціравалі 161 чырвонаармеец ці 8,2%, з якіх: у студзені – 25 чалавек, у лютым – 36, у сакавіку – 58; красавіку – 27, у маі – 4, у чэрвені – 14 чалавек.

У прыведзеную лічбу ўваходзяць таксама 109 ці 4,37% штрафнікоў, з якіх 102 служылі ў штрафных ротах, а 7 з'яўляліся афіцэрамі асобных штрафных батальёнаў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Беларусі ў пачатку 1944 г. [15, К. 7915486–5502, 7915538–5549, 7915607–5616, 7915640–5645, 7915662–5671, 7915689–5699, 7915724–5737, 7915772–5790, 7915847–5870, 7915945–5962, 7915994–6007, 7916040–6058, 7916109–6113, 7916163–6168, 7916187–6189, 7916203–6206, 791628–6231, 7916227–6231, 7916246–6247, 7916273–6276, 7916287–6290, 7916311–6313, 7916328–6332].

Паводле нямецкіх дакументаў атрымліваецца, што штрафнікі належалі да двух штрафбатаў (8-га і 33-га, які дзейнічаў пры 115-й стралковай брыгадзе), а таксама пяці штрафных рот (2-й роты 217 стралковай дывізіі, 188-й пры 42-м танкавым палку, 192-й, 257-й пры 1201-м стралковым палку 354-й стралковай дывізіі, 258-й пры 210-м стралковым палку 82-й стралковай дывізіі, 260-й пры 253-й стралковай дывізіі). Тады як савецкія ваеннапалонныя паходзілі з некаторых вышэй названых і іншых штрафных рот, у тым ліку: 33-га штрафбата пры 63-й арміі, 187-й штрафной роты, 188-й штрафной роты ў складзе 48-й арміі, 189-й штрафной роты пры 175 стралковай дывізіі, 190-й штрафной роты пры 307-й стралковай дывізіі, 192-й штрафной роты пры 102-й стралковай дывізіі, 257-й штрафной роты пры 354 стралковай дывізіі 65-й арміі, 258-й штрафной роты пры 210-м стралковым палку 82-й стралковай дывізіі, 262-й штрафной роты пры 193-й стралковай дывізіі, 263-й штрафной роты пры 303-м стралковым палку 69-й стралковай дывізіі [15, К. 7915486–5502, 7915538–5549, 7915607–5616, 7915724–5737, 7915847–5870, 7915945–5962, 7915994–6007, 7916040–6058, 7916109–6113, 7916187–6189, 7916203–6206, 791628–6231, 7916227–6231, 7916246–6247, 7916311–6313, 7916328–6332].

Наяўныя нямецкія матэрыялы даюць магчымасць скласці ўзроставую характарыстыку савецкіх дэзерціраў, а таксама выявіць некаторыя адметнасці. У першым выпадку бачна, што з агульнай колькасці 17 перабежчыкаў ці 10,6% былі народжаны ў другой палове 1890-х гадоў. Выключэннем быў толькі адзін чырвонаармеец, народжаны ў 1894 г. Трое з гэтай колькасці служылі ў штрафных ротах. У наступнай узроставай групе належала амаль трэць былых чырвонаармейцаў – 46 чалавек (28,7%),



Рэпазіторый ВДУ

з якіх 6 служылі ў штрафных ротах. Самую вялікую групу складалі народжаныя ў дзясятыя гады XX стагоддзя – 55 чалавек (34,3%), з іх толькі 8 ці 14,5% служылі ў штрафных ротах. На апошнюю групу, якая ахоплівае толькі 5 першых гадоў трэцяга дзесяцігоддзя, прыпадае 43 дэзерціраў (26,8%), з якіх 23 чалавека былі маладзейшыя за 20 гадоў, адзін з іх быў 1926 года нараджэння, г.зн толькі 18-гадовым юнаком. Заўважым, што 13 чалавек ці 30,2% былі народжаны ў 1924 г. З агульнай колькасці перабежчыкаў 30 чалавек ці 18,75% паходзілі з штрафных рот і батальёнаў. Сярод перабежчыкаў 9 мелі вайсковыя званні, у тым ліку: 1 капітан, 4 лейтэнанты, 1 – малодшы лейтэнант, 2 сяржанты і 1 малодшы сяржант.

Звернемся да данясення № 1 ад 2.01.1944 г. [16, К. 7915486–513]. На наш погляд, асаблівую навуковую каштоўнасць маюць разведвальныя звесткі, атрыманыя ў аддзеле нямецкай выведкі ў дачыненні да складу аднаго з гвардзейскіх стралковых палкоў 38-й гвардзейскай стралковай дывізіі (камандзір палка палкоўнік Шчарбакоў), якая разам з 110 і 113 гвардзейскімі стралковымі палкамі ўваходзіла ў склад LXXXXV гвардзейскага стралковага корпуса. Па стане на 11.11.1943 г. полк быў укамплектаваны ў складзе 523 чалавек (32 афіцэры, 77 сяржантаў і 414 радавых), з якіх 472 (з іх 3 афіцэры, 65 сяржантаў і 404 радавых) з'яўляліся новым папаўненнем, з іх 260 чалавек ужо былі ўдзельнікамі баёў, 22 былі членамі партыі, 49 прадстаўлялі саюз камуністычнай моладзі і 11 чалавек мелі ўзнагароды, у тым ліку 5 афіцэраў і 6 сяржантаў. З агульнай колькасці 473 чырвонаармейцы ці 90,5% прадстаўлялі рускіх – 275, украінцаў – 169 і беларусаў – 33, астатнія 50 чалавек былі прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей, сярод іх 9 – татараў, 6 – узбекаў, 6 – мардвіны, 3 – чувашы, 1 грузін, 1 – армянін і 20 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. Па ўзросце штатны склад падзяляўся на тых, хто быў народжаны раней чым у 1896 г. – 5 чалавек, 27 былі народжанымі ў прамежку паміж 1896 і 1898 гг., 31 – з 1898 па 1901, 50 – з 1902 па 1904, 26 – з 1905 па 1907, 34 – з 1908 па 1910, 52 – з 1911 па 1913, 29 – з 1914 па 1916, 80 – з 1917 па 1919, 85 – з 1920 па 1922, і 104 – з 1925 па 1925 г. Гэта азначае, што 298 чалавек ці 56,9% полк складалі чырвонаармейцы ва ўзросце да 30 гадоў.

З данясення № 2 ад 11.01.1944 г. [17, К. 7915539–5579] мы даведваемся аб іншым вайсковым падраздзяленні – гвардзейскім лыжным батальёне 37-й гвардзейскай стралковай дывізіі (камандзір дывізіі – генерал-маёр Ушакоў ), сфарміраваным у перыяд з 5 па 15 лістапада 1943 г., узброеным 8 снежня, але да канца года заставаўся без лыж. На працягу трох тыдняў праводзілася тактычная падрыхтоўка з працяглымі маршамі. На момант яго камплектавання камандзірам быў маёр Гранкін, на 29.12.1943 г. яго колькасць складала 364 чалавекі, у тым ліку: у склад 1-й стралковай роты ўваходзілі 99 чалавек, 2-й – 102, ўзвод выведкі складаў 23 чалавекі, узвод мінамётчыкаў – 36, танкавы каміндзірскі ўзвод – 20 чалавек, сапёрны ўзвод – 19, узвод падпальшчыкаў – 11, узвод сувязі – 11, санітарны

ўзвод – 7, гаспадарчы ўзвод – 22 чалавекі. Пры гэты згадвалася, што на працягу толькі апошняга тыдня снежня 1943 г. батальён згубіў 9 чалавек забітымі, 9 – параненымі і 3 зніклымі без звестак.

Адзначым, што ў гэтым жа данясенні прыведзены звесткі, датычныя 84 чырвонаармейцаў, якія патрапілі ў палон да немцаў, але памерлі на працягу апошняга месяца. Паводле іх салдацкіх кніжак аддзел нямецкай выведкі склаў наступную карціну: па ўзросце адзін з памерлых быў 1893 г., 14 былі народжанымі з 1894 па 1903 г, 27 – 1904 па 1913, 35 – з 1914 па 1923, 2 былі з 1924 і 5 з 1925 году нараджэння. У аспекце адукацыі звесткі былі такімі: не ўмелі чытаць і пісаць – 17 чалавек, скончылі 3 класы школы – 15, 4 гады – 12, навучаліся ад 5 да 7 класаў – 27 чалавек, 12 – скончылі ад 8 да 10 класаў, вышэйшую адукацыю меў 1 чалавек. Па кваліфікацыі: рабочымі былі 25 чалавек, сялянскае паходжанне мелі 45 чалавек, служачыя – 10, навучэнцы – 4. Членамі камуністычнай партыі бальшавікоў былі 7 чалавек, кандыдатамі ў партыю – 3, камсамольцамі – 3, беспартыйнымі – 71 чалавек. Па вайсковых званнях яны падзяляліся на камандзіраў і палітработнікаў – 4 чалавека, старшых лейтэнанты – 3, лейтэнанты – 5, малодшыя лейтэнанты – 5, старшына – 1, сяржанты – 5, малодшыя сяржанты – 1, яфрэйтар – 1, радавыя – 34, былыя цывільныя грамадзяне – 24, былы партызан – 1. У дакуменце прыводзіліся звесткі аб прыналежнасці да вайсковых часцей на ўзроўні дывізій і штрафных рот, у тым ліку: 16 чалавек служылі ў 4 (5), 8 (1), 55 (1), 73 (1) стралковых дывізіях, у 37 (5), 38 (2), 44 (1) гвардзейскіх стралковых дывізіях; наступныя 35 праходзілі вайсковую службу ў 108 (1), 110 (20), 139 (1), 169 (1), 170 (8), 197 (1) і 260 (2) стралковых дывізіях, 33 – у 283 (3), 323 (1), 348 (1), 362 (12), 413 (1) стралковых дывізіях; 5 служылі ў 176-й штрафной роце і астатнія 10 у іншых вайсковых часцях. Па нацыянальнай прыналежнасці яны складалі наступную карціну: 45 рускія, 8 – украінцаў, 12 – беларусаў, палякаў – 1, што складала 66 чалавек ці 78,5%; мардовы і чувашы складалі 2 чалавекі ці 2,5%, армяне і азербайджанцы – 2 чалавека (2,5%), 13 чалавек уключалы 10 узбекаў, 1 казах і 2 туркмены ці 15,5% і 1 з 84 памерлых быў яўрэй (1%).

Данясенне № 6 ад 4 лютага 1944 г. [18, К. 7915689–5721] дае чытачу магчымасць пазнаёміцца з падобным дадаткам, у якім размова ідзе пра 63 чырвонаармейца, якія загінулі за першы месяц новага 1944 года. У дачыненні да пасад, якія займалі яны: 11 – маёры, 1 старшы лейтэнант, 5 лейтэнантаў, 6 – малодшых лейтэнантаў, 1 – старшына, 1 – старшы сяржант, 2 – сяржанты, 1 – малодшы сяржант, 34 – радавыя і 11 – грамадзянскіх асоб; з 63 чалавек 32 былі рускімі, 7 – украінцамі, 4 – беларусы, усяго 69% славян і 31% іншых прадстаўнікоў, у тым ліку: 1 – чуваш, 3 – азербайджанцы, 6 – узбекаў, 1 – кіргіз, 1 – трукмен, 3 – таджыкі, 5 – казахаў. З вышэйшай адукацыяй не было нікога, ад 7 да 10 класаў навучання ў школе – 19 чалавек, ад 5 да 6–11, 4-класная адукацыя – 8,

Рэпазіторый ВДУ

ад 1 да 3 класы – 12, неадукаваныя – 13. Па ўзросце: з 1926 году – нікога, з 1925 – 4, 1924 – 6, з 1914 па 1923 – 20, з 1904 па 1913 – 24, 9 – 1893 па 1903 г. Па партыйнай прыналежнасці: члены партыі – 3, кандыдаты – 5, камсамольцы – 6, беспартыйныя – 49; сацыяльнае паходжанне: з сялян – 31, з рабочых – 23, служачых – 9. Прыналежнасць да вайсковых часцей: 5 чалавек – 33 сд, 5 чалавек – 60 сд, 4 чалавекі – 137 сд, 6 чалавек 307 сд, 6 чалавек 399 сд, па адным ці 2 чалавекі з розных часцей – 37 чалавек.

Не менш цікавым з'яўляюцца для чытача звесткі, падрыхтаваныя аддзелам выведкі ў дачыненні да нормаў харчовага забеспячэння чырвонаармейцаў у разліку на 1 дзень. Заўважым, што звесткі прыведзены на аснове допыту начальніка пункта забеспячэння 1090 стралковага палка лейтэнанта Віслабокава. Адпаведна ім чырвонаармейцы штодня атрымлівалі: 1) хлеба чорнага – 900 грам, з якіх 100 гр маглі быць заменены бульбай; 2) хлеба белага 2-га сорту – 20 гр.; 3) круп – 140 гр.; 4) макаронаў – 30 гр.; мяса – 180 гр.; 6) рыбы – 0 гр.; соевай мукі – 15 гр.; 8) тлушчы – 30 гр.; 9) алею – 20 гр.; 10, цурку – 35 гр.; чаю – 1 гр.; солі – 30 гр.; гародніны: бульбы – 500 гр., капусты – 170 гр., морквы – 45 гр, буракоў – 40 гр, цыбулі – 30 гр, агуркоў і супу з гародніны – 35 гр.; 14) таматнай пасты – 6 гр, 15) лаўровы ліст – 0,2 гр, 16) перцу – 0,3 гр.; 17) воцату – 2 гр.; 18) гарчычнага парашку – 0,3 гр.; 19) махоркі – 20 гр.; 20) запалак на месяц – 3 каробкі; 21) паверу для цыгарэт на месяц – 7 блокаў; 22) мыла туалетнага – 200 гр.

У данясенні № 7 ад 12.02.1944 г. [19, К. 7915724–5771] прыведзены малавядомыя звесткі, якія сведчаць аб тэхнічным забеспячэнні вайсковых часцей у студзені 1944 г. З дакумента вынікае, што абёмы розных паставак выраслі, з якіх: 8,7% былі адрамантаваны; 0,6% складалі пастаўкі для тылавых службаў, рэзервовых частак і абозаў, 90,7% – былі новымі пастаўкамі для вайсковых часцей. З папаўнення прыбылі без адукацыі – 9,3%, пасля кароткатэрміновай падрыхтоўкі – 33,0%, 57,7% рыхтаваліся ад 1 да 12 месяцаў. У плане нацыянальнасці: рускія складаюць – 67,2%, іншыя нацыянальнасці – 32,8%. Па ўзросце: 1926 год – 2,7%, 1925 – 15,8%, 1918 – 1924 – 29,4%, ад 1908 – да 1917 – 27,9%, з 1890 – па 1907 – 16,5%, і нішэй 1898 года – 7,7%.

Такія дасканалыя звесткі былі не выпадковымі. Паколькі ў аснове падрабязных допытаў ваеннапалонных і перабежчыкаў ляжалі апытальнікі, якія налічвалі дзясяткі самых розных пытанняў, у тым ліку: 1) пытанні асабістага кшталту, прыналежнасці да вайсковай часці, месца і абставіны палону, а таксама характару баявой дзейнасці падраздзялення Чырвонай арміі і г.д.; 2) пытанні прафесійнай адукацыі, пачатку службы ў войску, настрою сярод радавых і афіцэраў, адносін да вайны і інш.; 3) характарыстыкі вайсковых падраздзяленняў, іх узбраенняў, штатнага складу часцей, дзейнасці розных відаў узбраенняў, папаўнення і г.д.; 4) якія баявыя задачы выконваюць падраздзяленні на баявым участку наступлення ці абароны, што вызначана ў якасці аб'екта цэнтральнага ўдару, якія тактычныя сродкі выкарыстоўвае

Репозиторий ВГУ

баявой падраздзяленне і інш.; 5) характарыстыка поля бою з дакладнымі звесткамі (лакалізацыяй на карце), дакладныя звесткі пра лінію абароны, умацаванні, выкарыстанне палявых умацаванняў, мінных палёў і г.д.

Сярод матэрыялаў рознага кшталту хацелася б звярнуцца да некаторых дакладных даных, у першую чаргу персанальнага характару. У данясенні № 22 ад 1.06.1944 г. [20, К. 7916286–6308] змешчаны матэрыялы, якія на допыце пакінуў 16-гадовы чырвонаармеец, узяты ў палон у раёне г. Жлобіна. Менавіта ў той раён было накіравана пасля кароткай тактычнай і практычнай падрыхтоўкі стралковае падраздзяленне ў складзе 150 чалавек, галоўным чынам расійскіх юнакоў з Кіраўскага раёна РСФСР. Гэта была моладзь 1927/1928 гадоў нараджэння, сабраная ў складзе асобнага вучэбнага батальёна, які складаў 6 рот па 150 чалавек. Увогуле ў падраздзяленні атрымалі падрыхтоўку амаль каля 1000 чалавек. 15 лютага 1944 г. быў сфарміраваны эшалон і накіраваны ў раён г. Рэчыца, адкуль пешым маршам дабіраўся ў напрамку Жлобіна. У адным з лясных масіваў наша падраздзяленне было перададзена ў склад 40-й стралковага палка 102-й стралковай дывізіі.

З данясення вынікае, што у часці старэйшыя таварышы смяяліся з такога папаўнення, паколькі рост некаторых з іх не дасягаў 1,40 м. Паўсюдна гучала крыўдныя заўвагі, што цяпер вайну хочуць выйграць пры дапамозе малакасосаў. Хоць на справе старэйшыя таварышы былі пасяброўску настроены і ставіліся са спачуваннем. Выдадзеная форма была для нас завялікай. Пры маршыраванні мы цапляліся за полы шыняля або грукалі прыкладам вінтоўкі аб зямлю. 10 сакавіка, калі немцы пачалі наносіць баявы ўдар, я застаўся з-за страху ляжаць на зямлі і патрапіў у палон. У час гэтых баявых дзеянняў я быў вельмі ўражаны, асабліва калі пабачыў, што наша рота ў складзе 250 чалавек была цалкам разбіта і ў палон патравілі разам са мной яшчэ 28 параненых чырвонаармейцаў. Астатнія мае аднагодкі за часам нямецкага ўдару хутчэй за ўсё загінулі. Калі нас адпраўлялі на фронт у якасці папаўнення ў складзе стралковага батальёна, нам казалі, што немцы вельмі слабыя, што іх можна будзе выгнаць з захопленай тэрыторыі вельмі лёгка. Руская прапаганда настолькі запэўніла нас, што мы паверылі, што здолеем гэта зрабіць нараўне з дарослымі. Але на справе гэты было не так.

Такім чынам, першаснае знаёмства нават з некаторымі нямецкімі данясеннямі, дазваляе не толькі значна пашырыць уяўленні пра малавядомую дакументальную базу, але і атрымаць важныя звесткі для больш глыбокага вывучэння асобных старонак гісторыі першапачатковага вызвалення Беларусі. Уведзены матэрыял актуалізуе пытанне аб неабходнасці пастаноўкі на парадак дня сучаснай беларускай гістарыяграфіі адну з актуальных задач па крытычным аналізе падзей мінулага з мэтай максімальна поўнай рэканструкцыі гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. У пераліку такіх задач павінна стаяць



Репозиторий ВГУ

праца па ўвядзенні ў шырокі ўжытак малавядомых гістарычныя фактаў, без якіх на цяперашні час ужо немагчыма правядзенне ўсебаковага даследавання па згаданай праблематыцы. Відавочна, што фарміраванне новага інфармацыйнага кантэнту патрабуе не толькі ўвядзенне малавядомых нямецкіх крыніц, але і выкарыстанне метаду кампаратыўнага аналізу для далейшага аб'ектыўнага навуковага даследавання ваеннай мінуўшчыны.

Аналіз эмпірычных фактаў, выяўленых аўтарам гэтых радкоў сярод матэрыялаў калекцыі «Александрыйскія мікрафільмы», сведчыць аб невычэрпнасці крыніцазнаўчага патэнцыялу, які захоўваюць арыгінальныя нямецкія дакументы, пакуль не ў дастатковай меры выкарыстаныя беларускімі і замежнымі даследчыкамі для ўсебаковага вывучэння гісторыі вызвалення Беларусі ўвосень 1943 – пачатку 1944 г.


1. Освобождение Беларуси. 1943–1944 / редкол.: И.И. Басик [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 942 с.
2. Беларусь: памятное лето 1944 года : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 70-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков, Минск, 19–20 июня 2014 г. / редкол.: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2015. – 568 с.
3. Здановіч, У.В. Новыя падыходы да вывучэння вызвалення Беларусі ад нацысцкіх акупантаў у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі / У.В. Здановіч // Беларусь: памятное лето 1944 года : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 70-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистскихзахватчиков, Минск, 19–20 июня 2014 г. / редкол.: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2015. – С. 93–98.
4. Новікаў, С.Я. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў 1943–1944 гг. у сучасных айчынным і замежным гістарыяграфічных наратывах / С.Я. Новікаў // Векапомныя дні вызвалення : материалы Респ. науч.-практ. конф., посвящ. 75-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистскихзахватчиков, Гомель, 2 мая 2019 г. / под общ. ред. Е.К. Кириченко. – Гомель : БелГУТ, 2019. – С. 3–11.
5. Страна в огне : в 3 т. / редкол.: Литвин А.М. (гл. ред.) [и др.]. – Т. 2 : Кореннойперелом. 1942–1943 : В 2 кн. – Кн. 1. – М. : Абрис, 2018. – 734 с.
6. Страна в огне : в 3 т. редкол.: Литвин А.М. (гл. ред.) [и др.]. – Т. 3 : Освобождение. 1944–1945 : в 2 кн. – Кн. 1. / Суржик Д.В. – М. : Абрис, 2018. – 717 с.
7. Басюк, І. Ішлі ў бой штрафныя роты / І. Басюк // Беларуская думка. – 2000. – № 11. – С. 122–126.
8. Пыльцын, А.В. Правда о штрафбатах / А.В. Пыльцын. – М. : Яуза, 2007. – 368 с.
9. Пыхалов, И.В. Штрафбаты пообесторонынфронта / И.В. Пыхалов [и др.]. – М. : Яуза, 2007. – 482 с.
10. Пыльцын, А.В. Страницы истории 8-го штрафного батальона Первого Белорусского фронта / А.В. Пыльцын. – Минск : ИВЦ Минфина, 2009. – 448 с.
11. Пыльцын, А.В. Правда о штрафбатах. Как офицерский штрафбат дошел до Берлина / А.В. Пыльцын. – М. : Яуза, 2016. – 544 с.




Репозиторий ВГУ

12. Приказ народного комиссара обороны № 227, 28 июля 1942 г. // Мировые войны XX века : в 4 кн. – Кн. 4 : Вторая мировая война: документы и материалы / под ред. М.Ю. Мягкова. – М. : Наука, 2002. – С. 248–251.
13. Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. In 10 B-de. Bd. 8: Die Ostfront 1943/44. Der Krieg im Osten und an den Nebenfronten / Hrsg. von Karl-Heinz Frieser. – München : Deutsche Verlags-Anstalt, 2007. – 1319 S.
14. Новікаў, С.Я. «Александрыйскія мікрфільмы» як новая архіўная першакрыніца па ваеннай гісторыі Беларусі / С.Я. Новікаў // Вести Института современных знаний. – 2000. – № 2. – С. 60–69.
15. НАРБ. – Фонд «Александрыйскія мікрафільмы» (далей – АМФ). – № 180. – К. 7915486– 7916339.
16. AOK 9. Abt. I c/AO: Auszüge aus Gefangenenvernehmungen vom 2. Januar 1944 // НАРБ. – АМФ. – № 180. – К. 7915486–7915513.
17. AOK 9. Abt. I c/AO: Auszüge aus Gefangenenvernehmungen vom11. Januar 1944 // НАРБ. – АМФ. – № 180. – К. 7915539–7915579.
18. AOK 9. Abt. I c/AO: Auszüge aus Gefangenenvernehmungen vom 4. Februar 1944 // НАРБ. – АМФ. – № 180. – К. 7915689–7915721.
19. AOK 9. Abt. I c/AO: Auszüge aus Gefangenenvernehmungen vom 12. Februar 1944 // НАРБ. – АМФ. – № 180. – К. 7915724–7915771.
20. AOK 9. Abt. I c/AO: Auszüge aus Gefangenenvernehmungen vom 22. Juni 1944 // НАРБ. – АМФ. – № 180. – К. 7916286–7916308.

***Бондарева Е.М.***

## ДОКУМЕНТЫ ГОСУДАРСТВЕННОГО АРХИВА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ ВОЕННОЙ ПОВСЕДНЕВНОСТИ

Одним из популярных направлений в современной историографии является история повседневности, в рамках которой проводится изучение условий жизни, труда и отдыха людей в тот или иной исторический отрезок времени. Особый интерес у многих исследователей связан с периодом Великой Отечественной войны, события которой привели к серьезным изменениям в повседневности советского человека, его поведении и психологическом восприятии мира.

Реконструировать повседневную жизнь, посмотреть на военное время глазами обычного человека, в том числе женщин и детей, позволяют документы, хранящиеся в Государственном архиве Витебской области.

Огромный документальный материал по истории военной повседневности содержится в фонде № 9742-п «Коллекция документов с воспоминаниями участников Великой Октябрьской социалистической революции, гражданской войны, Великой Отечественной войны, ветеранов партии и труда». В фонде насчитывается 459 дел за 1917–1990, 1994 гг. Особый интерес представляют воспоминания участников и очевидцев событий Великой Отечественной войны (о деятельности 3-й Белорусской партизанской бригады, Осинторфского комсомольского подполья, расстреле детей

Репозиторий ВГУ